## *Тэма 9 ВЫВУЧЭННЕ ВУСНАЙ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ*

1 Методыка работы з казкамі, легендамі і паданнямі.
2 Спецыфіка вывучэння малых фальклорных жанраў.
3 Вывучэнне народных песень у школе.

### 1 Методыка работы з казкамі, легендамі і паданнямі

Далучэнне вучняў да ВНТ пачынаецца ў 5 класе са знаёмства з досыць вялікай колькасцю фальклорных жанраў: казкамі, легендамі, загадкамі, прыказкамі, прыкметамі, павер’ямі, пазней – песнямі. Задача настаўніка – паказаць спецыфіку кожнага з гэтых жанраў і праз далейшае параўнанне з творамі прафесійнай літаратуры прадэманстраваць цесную сувязь апошняй з беларускім фальклорам як крыніцай узнікнення многіх мастацкіх тэкстаў.

**Народныя казкі** вывучаюцца толькі ў 5 класе. Гэта адзін з самых улюбёных для вучняў фальклорных жанраў. Яны адпавядаюць памкненням дзяцей да незвычайнага, фантастычнага, гераічнага, таямнічага. Прыцягальным для юных чытачоў з’яўляецца і абавязковая перамога дабра над злом. Таму вельмі важным становіцца стварэнне асаблівай “казачнай” атмасферы на ўроку. Увесці дзяцей у свет казкі, акрамя слова настаўніка аб гэтым жанры, рэпрадуктыўнай гутаркі аб вядомых дзецям казках, дапамогуць прыёмы ілюстравання (выстава малюнкаў па матывах вядомых дзецям казак, дэманстрацыя рэпрадукцый карцін мастакоў, урыўкаў мультфільмаў ці кінаэкранізацый), інсцэніраванне ўрыўкаў ці невялікай казкі, віктарына, прыёмы гульні (“Адгадай персанажа” па яго выказванні, прадмету, які яму належыць, “Назаві казку” па ключавых словах і г. д).

Да стварэння гульнёвых элементаў неабходна падыходзіць творча. Гэта можа быць прыём “*салата з казак*”: настаўнік сачыняе і расказвае дзецям міні-казку, складзеную з алюзій-адсылак (герояў, прадметаў, матываў) розных казак. Дзеці павінны заўважыць і назваць гэтыя элементы. Гэта не толькі актывізуе ўвагу, але і развівае назіральнасць. “*Казка навыварат*”: назва казкі падаецца ў выглядзе кантэкстуальнага антоніма, сапраўдны варыянт назвы павінны агучыць вучні: “Зялёная хустачка”; “Мыш у лапцях”; “Аповед пра простую курачку”; “Аповед пра жывую сялянку і аднаго слабака” і г. д. “*Творчая памылка*”: агучваецца знарок памылковая інфармацыя па некалькіх казках (побач з памылковымі абавязкова павінны быць адзін ці некалькі правільных варыянтаў), якую павінны паправіць дзеці. Матэрыял можа быць самы розны – ад скажэння элементаў сюжэта пэўнага эпізода да дэталяў апісання пэўнага героя, кшталту: “Мальвіна – дзяўчынка з ружовымі валасамі”. У любым выпадку эмацыянальная афарбоўка ўступнага этапа на гэтым уроку павінна быць дакладна прадумана. Так, пры вывучэнні чарадзейнай казкі неабходна стварыць атмасферу загадкавасці, таямнічасці, сацыяльна-бытавой – можна настроіць дзяцей на гумарыстычны лад.

Пасля падрыхтоўчай работы трэба пазнаёміць дзяцей з тэорыяй: законамі будовы казкі (зачын, сталая канцоўка, трохразовыя паўторы, гіпербалы), адрозненнямі паміж літаратурнай і фальклорнай казкамі, рознымі відамі казак (казкі пра жывёл, сацыяльна-бытавыя і чарадзейныя). Неабходна давесці, што казкі пра жывёл невялікія па памеры, у іх значнае месца належыць дыялогу, створаны вобразы-тыпы, носьбіты пэўных чалавечых якасцей: працалюбства, хітрасці, баязлівасці і г.д. Раскрыццё гэтай алегорыі, як і пры вывучэнні байкі, павінна адбывацца на заключным этапе аналізу твора. Атрыбутыўнай прыкметай чарадзейных казак з’яўляюцца фантастычныя пераўтварэнні, чароўныя прадметы. Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на высвятленне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

накіраванасці чарадзейных сіл (каму яны дапамагаюць і як гэта характарызуе герояў казкі). Неабходна падкрэсліць іранічна-сатырычную афарбоўку многіх сацыяльна-бытавых казак, спецыфіку фантастыкі ў іх (тут героі – простыя людзі, якія не валодаюць звышнатуральнай сілай, але перамагаюць сваіх ворагаў дзякуючы мудрасці, кемлівасці і знаходлівасці). Адзначаныя рысы становяцца і вядучымі напрамкамі аналізу кожнага віду казкі. Можна выбраць любы шлях тлумачэння – ісці ад тэорыі (слова настаўніка, знаёмства з артыкулам падручніка, графічныя формы, апераджальныя заданні) ці адштурхоўвацца ад чытацкага вопыту вучняў (эўрыстычная гутарка, стварэнне праблемнай сітуацыі), але ў любым выпадку ўсе тэарэтычныя паняцці павінны быць праілюстраваны на прыкладзе вядомых тэкстаў.

**Першаснае чытанне** казкі ажыццяўляецца настаўнікам у класе. Многія метадысты настойліва раяць расказваць, а не чытаць казкі, бо гэтае патрабаванне абумоўлена жанравай прыродай гэтых твораў. Па-першае, настаўнік павінен выключна ведаць тэкст казкі (а не падглядваць у кнігу). Паколькі расказванне казкі прадугледжвае варыяцыі, то гэта, на першы погляд, нескладана. Аднак найбольш уважлівыя вучні могуць звярнуць увагу на “прапушчаныя” ці “скажоныя” эпізоды. Па-другое, неабходна выкарыстоўваць стыль, характэрныя казачныя звароты і формулы і хораша валодаць інтанацыяй, яе зменамі пры агучванні розных персанажаў, карыстацца жэстамі і мімікай, іншымі словамі, мець пэўныя акцёрскія здольнасці, на некаторы час пераўтварыцца ў казачніка. Казкі апавядаюцца няспешна. Розныя віды казак патрабуюць рознай інтанацыі: сацыяльна-бытавая – разважлівага, часам іранічнага тону; казкі пра жывёл – часта спачувальнай інтанацыі ў адрас пакрыўджаных жывёл; чарадзейная – выразу таямнічасці, інтрыгі. Пры гэтым характэрныя казачныя формулы, словы-выразы падкрэслена выдзяляюцца голасам.

Методыка **аналізу казкі** вельмі блізкая да методыкі вывучэння апавядання, таму і сістэма прыёмаў і форм работы ў многім падобная. Асаблівая ўвага надаецца павобразнаму аналізу, які рэалізуецца праз параўнальную характарыстыку герояў-антаганістаў, спалучаную з выбарачным чытаннем, адметнасцям кампазіцыі, назіранням над моўнымі асаблівасцямі твора (вызначэнне сродкаў, якія ствараюць напеўнасць, спецыфічны каларыт даўніны, трапнасць і прастата выразаў, уласцівых жывому маўленню, моўнае афармленне казачных зачынаў і канцовак, складанне слоўніка казкі, “стылістычны эксперымент”, параўнанне маўлення розных герояў і інш.), супастаўленню казкі і ідэйна сугучных ёй літаратурных твораў. Варта памятаць, што “разбор” казкі не павінен парушыць агульную атмасферу, створаную настаўнікам.

Казачныя сюжэты даволі лёгка запамінаюцца і пераказваюцца дзецьмі, таму на ўроках па вывучэнні гэтага фальклорнага жанру вялікая роля надаецца развіццю звязнага маўлення вучняў. Пасля аналізу пажадана правесці працу над пераказам. Паколькі казкі, як было зазначана вышэй, вывучаюцца ў 5 класе, то ён носіць навучальны характар. Складанне плана абавязковае, калі казка вялікая па памеры.

Сістэма заданняў на **заключным этапе** можа ўключаць інсцэніраванне, творчы пераказ (заданні кшталту “Што было б, калі…”, “Што было потым…”) ці самастойнае сачыненне (можна вуснае) уласнай казкі. Гэта можа быць складанне “казкі наадварот” (злыя тры парсючкі і наіўны воўк), напісанне казкі па прапанаваных настаўнікам назвах ці пачатку. Варта памятаць, што фантазію дзяцей часцей актывізуе нетрывіяльнасць, а то і парадаксальнасць. Таму назвы патэнцыйных казак павінны адпавядаць гэтаму патрабаванню (“Непрыгожая прынцэса”, “Мудры вослік”, “Спагадлівы воўк” і г. д.).

Разгляд **легендаў, паданняў і міфаў** у цэлым падобны да методыкі вывучэння казак, аднак трэба ўлічваць іх жанравую спецыфіку. Пажадана, каб пры вывучэнні міфаў настаўнік звярнуў увагу не толькі на пантэон вышэйшых боставаў, а і ўдзяліў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

увагу ніжэйшым істотам, якія сустрэнуцца вучням у праграмных літаратурных творах. Асабліва гэта тычыцца спецыфічна беларускіх істот (цмок, хохлік) ці тых, якія маюць у нашай міфалогіі адрозныя ад суседніх народных культур функцыі (ваўкалак).

## 2 Спецыфіка вывучэння малых фальклорных жанраў

Надзвычай эфектыўна ўзбагачае лексічны запас вучняў работы з **прыказкамі і прымаўкамі**. Варта памятаць, што праца з гэтым матэрыялам не павінна скончыцца разам з завяршэннем адпаведнай тэмы. Неабходна сістэматычна звяртацца да прыказкавай спадчыны пры аналізе таго ці іншага твора і заахвочваць вучняў да выкарыстання твораў гэтага жанру ў сваім маўленні. Вынікам работы па вывучэнні прыказак павінна стаць усведамленне іх ролі ў маўленні; пераноснага сэнсу і абагульнення, заключанага ў прыказках; завучванне іх на памяць; увядзенне ў слоўнікавы запас вучняў і карэктнае ўжыванне; разуменне сутнасці гэтага жанру як лаканічнага, трапнага выказвання, якое нясе ў сабе маральна ўзважаны, мудры погляд на жыццё; засваенне структуры прыказак: супастаўленне (“Якая справа – такая і слава”), паралелізм (“Цяжка саду без зязюлі, цяжка доньцы без матулі”), параўнанне (“Родная зямелька – як зморанаму пасцелька”), прычынна-выніковая сувязь (“Хто працуе, той не сумуе”), паўторы (“Рука руку мые”).

**Сістэма прыёмаў працы**:

а) Заданні, накіраваныя на высвятленне ***ўнутранага сэнсу***:

1 Выпісаць 3–4 прыказкі на тэмы сяброўства, радзімы, вучобы і г. д. са зборніка прыказак ці з падрыхтаваных настаўнікам картак.

2 Класіфікаваць прыведзеныя ў падручніку прыказкі паводле тэматыкі.

3 Выбраць прыказку, якая характарызуе ідэю прапанаванага настаўнікам міні-тэксту.

4 Знайсці ў прапанаваным міні-тэксце прыказкі, растлумачыць іх сэнс.

5 З прапанаванага спісу выбраць прыказкі-“сінонімы”.

6 Выразнае чытанне (вылучэнне апорных слоў і правільнае інтаніраванне).

б) Заданні, накіраваныя на ***развіццё маўлення***:

1 Прапанаваць уставіць прапушчанае слова ў прыказкі: На першым этапе гэта можа быць антонім: *“Дзе шчырая праца, там густа, а дзе лянота, там …”.* На наступным уроку можна ўскладніць заданне, прапусціўшы любое слова, якое павінны ўзнавіць дзеці, тым самым прадэманстраваўшы, як яны запомнілі вывучаныя імі афарыстычныя выразы.

2 “*Аднаві прыказку*”: па пачатку ўзгадаць канцоўку ці злучыць пачатак і канец “разламаных” прыказак, запісаных у 2 слупкі.

3 Параўнанне сінанімічных прыказак розных народаў, назіранне за іх спецыфікай. Прымаўкі можна ў хаатычным парадку размясціць у тры слупкі (на дошцы ці на картках) і прапанаваць дзецям адшукаць адпаведнікі (вусна, злучыць лініямі і г. д.). Ва ўсіх акрэсленых вышэй заданнях, вучні павінны растлумачыць сэнс прыказак.

4 “*Сачыні прыказку”:* аб’яднаўшы пачатак і канец розных прыказак, паспрабаваць скласці новую, з новым зместам.

В) Творчыя заданні, накіраваныя і на разуменне падтэксту, і на развіццё маўлення.

1 Прыдумаць жыццёвую сітуацыю, якой адпавядае тая ці іншая прыказка.

2 Скласці апавяданне, у тэкст якога будуць уведзены прыказкі і прымаўкі.

3 Напісанне міні-сачынення (займальнай гісторыі) аб паходжанні прыказкі. Узор сачынення павінен быць складзены калектыўна ў класе. Безумоўна, такія творчыя заданні павінны ацэньвацца толькі станоўча, а няўдалыя – не ацэньвацца зусім.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Павер'і і прыкметы** дапамогуць вучням спасцігнуць неабходнасць жыцця ў гармоніі з прыродным светам, што было неад'емнай уласцівасцю светапогляду нашых продкаў. Пры вывучэнні народных прыкмет і павер'яў настаўнік павінен раскрыць іх значэнне і функцыі ў народным жыцці (дарадчая, перасцерагальная і забаронная), прадэманстраваць іх тэматычную разнастайнасць і акцэнтаваць увагу на выхаваўчым кампаненце ўрока. Тут можна скарыстаць міжпрадметныя сувязі з прыродазнаўчымі навукамі, пазнаёміць дзяцей з кнігай "Дзень за днём" (1997).

Вялікую ролю для развіцця лагічнага і асацыятыўнага мыслення, назіральнасці, уяўлення адыгрываюць **загадкі** – вобразна-іншасказальнае апісанне з'яў і рэчаў. Загадкі трэба чытаць таямнічым, "загадкавым" голасам, некалькі разоў, каб усе вучні добра зразумелі змест. Працэс работы над загадкамі павінен уяўляць сабой займальную эмацыянальна-інтэлектуальную дзейнасць, а не механічнае запамінанне твораў разам з адгадкамі. Завучванне загадак карыснае толькі на апошнім этапе іх вывучэння з мэтай задаць пасля сябрам, бацькам і г. д. У выніку няправільнай методыкі работы ў школе нават дарослыя часта могуць "адгадаць" толькі тыя загадкі, адказы на якія *ведаюць* з дзяцінства. *Прыёмы:*

1) "*Далікатныя" падказкі* на навучальным этапе работы з загадкамі абавязковыя па некалькіх прычынах. Па-першае, нават даросламу чалавеку складана адгадаць наступныя дзіцячыя загадкі: *Устаў белы бык, у акно пальчык тык. У адным клубочку ды сем дзірачак. Вярхом сядаю, на каго не знаю, знаёмага ўбачу, адразу саскочу.* Сітуацыя зменіцца, калі паведаміць тэматычныя блокі, да якіх гэтыя загадкі адносяцца: прырода (ці больш вузка – час), чалавек (часткі цела), чалавек (адзенне). *Адгадкі: дзень, галава, шапка.* Па-другое, многія загадкі, трапіўшы ў розныя тэматычныя цыклы, могуць набываць шматлікія варыянты правільных адказаў. *Хоць зубоў не мае, а балюча кусае.* Крапіва? Мароз? Камар? Ці новы швэдар? *Два браты, адзін на аднаго глядзяць, а разам не сыдуцца.* Берагі (тэма – прырода), столь і падлога (тэма – хата). "Падказкай" можа быць

А) падрыхтоўка плакатаў з адказамі-малюнкамі; адказы павінны быць змешчаны ў хаатычным парадку. Гэты прыём часта выкарыстоўваюць аўтары падручнікаў пры той умове, што прапанаваныя загадкі належаць да розных тэматычных груп;

Б) падача загадак тэматычнымі блокамі з аб'яўленнем тэмы. Тэматычныя групы могуць быць шырокімі: чалавек, прырода, гаспадарка, асвета і г. д. і больш вузкімі. Ступень неабходнай канкрэтызацыі выбірае настаўнік, улічваючы складанасць саміх загадак і ўзровень мысленчай актыўнасці дзяцей. Трэба ўлічваць і варыятыўнасць адказаў у межах адной тэматычнай групы і ўхваляць імкненне дзяцей заўважыць усе прадметы, якія адпвядаюць пададзенаму комплексу прыкмет. Да прыкладу: *Пад адной шапкай чатыры браты жывуць*. Адгадка – *стол*, але насамрэч гэтаму адпавядаюць многія прадметы мэблі.

В) крыжаванка, дзе ў якасці заданняў выступаюць загадкі, а ключавое слова адлюстроўвае тэму.

2) тлумачэнне незразумелых слоў. Паколькі народныя загадкі часта ўтрымліваюць у сабе архаізмы і гістарызмы, для паспяховага рашэння неабходна тлумачыць гэтыя словы яшчэ да таго, як загадка прагучала. Прыклад: Блакітная *дзяружка* ўвесь свет пакрыла.

3) тлумачэнне механізму пабудовы загадак (параўнанне, супрацьпастаўленне, адмаўленне, іншасказанне), што можна зафіксаваць у табліцы; разгляд розных відаў загадак (загадкі-пытанні, загадкі-задачы, загадкі-рыфмаванкі, загадкі-жарты).

*А) Што без вады плавае?* (Воблака)

*Б) Сядзяць тры каты: супраць кожнага па два. Колькі іх?* (Тры)

*В) І ў сто гадоў я малады.*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*Маё насенне – жалуды.* (Дуб)
*Г) Чаму карова кладзецца?* (Бо садзіцца не ўмее).
У рыфмаванках адгадка можа стаць і апошняй рыфмай.

4) выбар правільнай адгадкі з некалькіх, якія валодаюць толькі асобнымі прыкметамі: *Крылле ёсць, ды не лятае, ног няма, а не дагоніш.*
А) вятрак; б) вецер; в) рыба.

5) абгрунтаванне адгадкі – вызначэнне комплексу прыкмет, якія апісваюць рэч. Дзеці павінны патлумачыць, якія прыкметы-асацыяцыі ўказваюць на адгадку. Цяжкасць у тым, што вучні павінны назваць усе прыкметы, каб вызначыць прадмет.

6) дапаўненне вядомай загадкі новымі прыкметамі з мэтай атрымаць новую. Што гэта: *Без языка, а гаворыць*? (Кніга). Дапоўніце загадку, каб атрымалася адгадка – пісьмо (…, без крылаў, а лятае); радыё, тэлевізар і г. д.

7) сачыненне ўласных загадак вучнямі. У якасці самастойнай работы такое заданне можна прапанаваць толькі пасля калектыўнай папярэдняй работы.

- Як выглядае і паводзіць сябе певень? (важны, на галаве грэбень, на нагах шпоры, кожную раніцу ўсіх будзіць). Да чаго падобны грэбень па форме? (да кароны) У каго яшчэ ёсць шпоры? (у гусара) і г. д. У выніку складваецца загадка: *Не кароль, а ў кароне, не гусар, а пры шпорах, гадзінніка не мае, а час абвяшчае.*

Увогуле, заданні для спасціжэння сутнасці загадак могуць быць і іншыя. Галоўнае тут – творчая фантазія настаўніка і эфектыўнасць прыёмаў па развіццю мыслення і мовы. Для падрыхтоўкі ўрока па вывучэнні загадак і далейшага заахвочвання вучняў да працы з гэтым фальклорным жанрам настаўнік можа выкарыстаць кніжную паліцу: зб. “Загадкі” (1972), “Беларускія загадкі” (1989) Я. Саламевіча, “Зайкі-загадайкі” У. Мацвеенкі і інш.

## 3 Вывучэнне народных песень у школе

З народным меласам вучні знаёмяцца ў 6 і 8 класах. Вучні павінны пазнаёміцца з каляндарна-абрадавымі, сямейна-абрадавымі і пазаабрадавымі песнямі, іх мастацкімі асаблівасцямі, адрозненнямі ад аўтарскай песні, часам і ўмовамі выканання, функцыямі. Песні, змешчаныя ў падручніку, можна дапоўніць і нават замяніць мясцовымі, характэрнымі для рэгіёна, дзе знаходзіцца школа.

Пачынаючы працу над каляндарна-абрадавымі і сямейна-абрадавымі песнямі, неабходна патлумачыць іх паходжанне, падаць класіфікацыю. Ва ўступным слове варта расказаць, што каляндарна-абрадавыя песні выконваліся пад час святаў, вызначаных земляробчым календаром, дзе вылучаліся чатыры цыклы: веснавы, летні, восеньскі, зімовы. Кожнаму з іх адпавядалі і канкрэтныя песні (калядныя, валачобныя, вяснянкі, купальскія, жніўныя і г. д.), у якіх паэтызавалася шчодрасць, шчырасць, працавітасць, кемлівасць, добразычлівасць беларуса (вызначэнне адметнасцей паказу гэтых якасцей і будзе адным з накірункаў далейшага аналізу). Сямейна-абрадавыя былі звязаны з найбольш значнымі падзеямі ў жыцці чалавека: нараджэннем, вяселлем, смерцю. Песні іншай тэматыкі, якія не выконваліся пад час таго ці іншага абраду, называюцца пазаабрадавымі.

Трэба пазнаёміць вучняў з паняццем “абрад” як сукупнасцю строга акрэсленых дзеянняў, якія суправаджаліся песнямі, што атрымалі назву абрадавыя. Для больш глыбокага асэнсавання варта даць апераджальныя заданні распытаць у бацькоў ці сваякоў пра адметнасці і паслядоўнасць таго ці іншага абраду, месца і ролю ў ім песень, іх тэксты, што адначасова паспрыяе і ўключэнню эмацыянальнай сферы дзяцей у працэс навучання. У якасці кніжнай паліцы можна выкарыстаць наступныя

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

зборнікі: “Песні сямі вёсак” (1973), “Песні народных свят і абрадаў” (1974), “Лірычныя песні” (1976).

Першаснае знаёмства з песняй пажадана ажыццяўляць у сукупнасці тэкставага і музычнага кампанентаў (фоназапіс, выкананне настаўніка). Абавязковай з’яўляецца слоўнікавая работа. Асаблівую ўвагу трэба надаць тлумачэнню спецыфічных слоў*: каляда, шчадраваць, куцця* і інш.

На этапе аналізу неабходна так фармуляваць пытанні, каб вучні пры адказе выкарыстоўвалі лексіку і сінтаксічныя звароты народных песень. Работа над вобразна-выяўленчымі сродкамі павінна прадэманстраваць, што нашы продкі верылі ў магічную сілу слова, у наяўнасць душы ва ўсім існым на зямлі. Асаблівую ролю трэба надаць рабоце над вобразамі-сімваламі. Усвядоміць адну з важнейшых адметнасцей фальклору – варыятыўнасць – дапаможа параўнанне некалькіх варыянтаў песень. Супастаўленне апісання народнага свята (да прыкладу, каляд) у запісах этнографаў, мастацкім творы і народнай песні дазволіць адчуць спецыфіку апошняй. Немалаважным пры аналізе з’яўляецца і сувязь з папярэдне вывучаным матэрыялам: паэтыкай фальклору (на прыкладзе іншых жанраў), зместам і функцыямі міфаў (Каляда, Вырай, Ярыла і інш.).

На заключных занятках настаўнік павінен сцвердзіць думку, што слова – гэта важны, але не адзіны элемент абраду, паказаць значэнне музычнага, харэаграфічнага, драматычнага і мастацка-дэкаратыўнага элементаў. Гэтаму паспрыяе і паказ відэазапісу ці пастаноўка пэўнай часткі абраду.

Такім чынам, знаёмства школьнікаў з творамі беларускага фальклору мае вялікі выхаваўчы патэнцыял, спрыяе ўмацаванню нацыянальнай самасвядомасці вучняў і дапаможа прадэманстраваць, што ў выглядзе твораў ВНТ мы маем багатую духоўную спадчыну, праз якую нашы продкі дбалі аб выхаванні падрастаючых пакаленняў.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ